"Цікавасць да анархізму правілася сама, – адзначаў Аліневіч. – *Магчыма, крыху пад уплывам рамана Тургенева "Бацькі і дзеці". У 11-м класе на экзамене па гісторыі замест пытанняў з білета я абараняў рэферат "Нестар Махно: бандыт ці народны герой?". Нават тады, у 2001-м, гэта была "бомба".*



Ігар з дзяцінства любіў камп'ютары і матэматыку, хацеў стаць інжынерам, паступіў у Мінскі радыётэхнічны інстытут.

Другім яго захапленнем стала ролевае мадэліраванне. Гэта нешта сярэдняе паміж гістарычнай рэканструкцыяй і інтэрактыўным тэатрам.

Пасля інстытута Ігар Аліневіч уладкаваўся на працу на круізны лайнер кампаніі Carnival у Карыбскім моры, але доўга там не затрымаўся. Праз сем месяцаў працы паспрабаваў падняць рабочых у пагрузачны дзень на забастоўку, пасля чаго яго звольнілі і пад канвоем адправілі ў аэрапорт.

Вярнуўся дадому, тры гады працаваў у невялікай фірме па праектаванні мікраэлектронікі. Пасля працаваў у ААТ "Пеленг" – праектаваў друкаваныя платы для касмічных спутнікаў.

"Мне вельмі падабалася работа, але ў той жа час я бачыў, што з кожным годам краіна апускаецца ў дыктатуру ўсё больш і больш, – шчыра прызнаваўся хлопец. – *Ніякія грошы і камфорт не прымусілі б мяне заплюшчыць на гэта вочы. І я з галавой акунуўся ў анархічную дзейнасць. Мы спрабавалі разгайдаць рабочых МАЗа, іншых прадпрыемстваў. Тады ўсё і пачыналася…"*

8 лістапада 2010 года Ігар Аліневіч быў затрыманы ў Маскве і перададзены беларускім спецслужбам.

27 мая 2011 года ён быў асуджаны на 8 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі. Аліневіча абвінавацілі паводле часткі 2 артыкула 339 КК РБ (хуліганства, здзейсненае групай асоб) і частак 2 і 3 артыкула 218 КК (пашкоджанне маёмасці небяспечным спосабам і ў асабліва буйным памеры).

Першапачаткова Ігара Аліневіча абвінавачвалі ў злосным хуліганстве (ч. 2 арт. 339 КК) па эпізодах нападу на расійскае пасольства ноччу з 30 на 31 жніўня 2010 года, а таксама за ўдзел у акцыі каля Генштаба Узброеных сіл Беларусі 19 верасня 2009 года. Затым абвінавачванне было пашырана: акрамя эпізоду па Генштабе Аліневічу інкрымінавалі напады на казіно "Шангры Ла", на офіс банка "Масква–Мінск" 31 мая 2010 года, на расійскае пасольства 30 жніўня 2010 года і на Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў (ЦІП) на Акрэсціна 6 верасня 2010 года.

У судзе ад анархісцкіх поглядаў Аліневіч не адмовіўся, сваёй віны не прызнаў.

З калоніі Аліневіч выйшаў у 2015 годзе: тады Аляксандр Лукашэнка вызваляў палітвязняў і падпісваў памілаванні ўсім – нават тым, хто пра іх і не прасіў.

Пасля вызвалення Ігар з'ехаў у Польшчу, дзе жыў і працаваў, і на радзіму як быццам вяртацца не збіраўся. Ніхто нават і не ведаў, што ў кастрычніку Аліневіч знаходзіўся ў Беларусі.

Які чынам будзе далей развівацца "справа анархістаў"? Які будзе прысуд? Час пакажа.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПЕРАСЛЕД

Помста за ўдзел у агульнанацыянальным страйку

У Гродне па прадпісанні праваахоўных службаў спынілі працу дзясяткі прыватных крам і кавярняў. Прадпрымальнікі кажуць, што гэта помста за іх удзел у агульнанацыянальным страйку.

Цяпер звычайная справа, калі на дзвярах кавярань або прыватных крам у цэнтры Гродна вісяць абвесткі, што ўстанова не працуе на працягу месяца альбо трох у сувязі з прадпісаннем пэўнай праваахоўчай структуры.

Уласнік крамы нацыянальных сувеніраў "Цудоўня" **Андрэй Несцяровіч** распавёў, што праблемы пачаліся адразу пасля 26 кастрычніка. У яго краме розныя службы правялі аж тры пазапланавыя праверкі. Аштрафавалі на 10 базавых велічынь за неналежную арганізацыю супрацьпажарнай бяспекі. *"Такой хвалі праверак не было за апошнія 20 гадоў. Усе мы добра ведаем, у сувязі з чым праверкі пайшлі па прадпрымальніках"*, – заўважае спадар Несцяровіч.

Уласніцы кнігарні з дзіцячымі кніжкамі спадарыні Святлане органы дзяржстандарту выпісалі прадпісанне на тры месяцы. Яна кажа, што наўрад ці здолее адновіць дзейнасць.

Акрамя дробных прыватных крам і кавярняў па прадпісанні праваахоўчых службаў спынілі працу і цэлыя гандлёвыя сеткі кшталту Megatop і OZ. Прычым па ўсёй Беларусі.

Алесь ЗАВІНОЎСКІ.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Пакуль завезлі ў райаддзел, а потым, можа, на расстрэл...

1 лістапада так званыя праваахоўнікі на "бусіках" ганяліся па полі каля Курапатаў за людзьмі, якія прыйшлі туды, каб памянуць продкаў.

На векавечныя "Дзяды"
Шануюцца ў народзе продкі –
Прыходзяць людзі на клады.
Прынамсі, так было заўжды,
Бо мы не пустадомкі ўсё-ткі.
І ў гэты раз сабраўся люд
Там, дзе агульныя магілы.
І быццам трапіў люд на суд
Не Бога, а нячыстай сілы:
За тымі, хто туды прыйшоў,
Бы ў сне, ганяліся пачвары.
Спецназ прыдумаў тое "шоу" –
Наладзіў на людзей сафары.
Здавалася, штосьці ў гэты дзень
Байцы ў сабе людзей забілі,
Калі шалёна на людзей
Скіроўвалі аўтамабілі.
Яны ў душы адчулі ўздым,
Азарт прачнуўся паляўнічы.
На паляванні дзікім тым
Байцы займелі шмат здабычы.
Вазілі колісь на расстрэл
Па гэтым курапацкім полі.
Цяпер завезлі ў райаддзел –
Пакуль пазбеглі той жа долі...
***
Ды "паляўнічыя" пасля
Сафары згадваць мусяць са страхам,
Бо помніць нашая зямля
Пра лёс паганы караля –
Яго назваў пісьменнік Стахам*...

*Дзікае паляванне караля Стаха" – так называецца знакаміты твор Уладзіміра Караткевіча.

Галодны прыйдзе да стала – гатовы з'есці і вала

А.Лукашэнка сцвярджае, што ён удосталь "наеўся прэзідэнцтва" і "не трымаецца за ўладу пасінелымі рукамі". Сайт TUT.by палічыў, што пачынаючы з 1994 года гэтак ён гаварыў не менш за 10 разоў...

Не мае ўлада тармазоў,
Пра гэта знаюць нашы людзі...
Напрыклад, Бацька шмат разоў
Сябе амаль што біў у грудзі,
І нам усім даводзіў ён:
– Калі я надакучу люду,
Трымацца, так сказаць, за трон
Рукамі сінімі не буду.
Нялёгкі хлеб. За многа год
Удосталь я наеўся ўлады...
І спачуваў яму народ:
– Ён заслугоўвае спагады.
І тым не менш прыйшла пара,
Калі сказалі людзі:
– Годзе!
На іншага правадыра
Надзеі выспелі ў народзе.
Усёды заклікі:
– Сыходзь!
На "троне" пасядзеў – і досыць!
Ды ён сысці не хоча, хоць
І абяцаў, як люд папросіць.
Выходзіць, не "наеўся" ён,
Дарма, што "пасінелі рукі".
Трывацьмем мы да скону дзён,
А следам – нашы дзеці-ўнукі?..
***
Падсеўшы ў хаце да стала,
Дзе гаспадар жыве ў раскошы,
З'ясі, гаворыць, і вала,
Як маеш апетыт харошы...

Хто каго абрабаваў

Феміда лёс кладзе на шалі.
– Чаму вы банк абрабавалі?
Падсудны секануў з пляча:
– Ён першым рабаваць пачаў!

Каб вас насілі на руках

Вы, пэўна, марыце, дзяўчаты,
Каб вас насілі на руках –
Ва ўсякім разе хоць у сьвяты.
У рукі вам, як кажуць, сцяг!
Дабіцца мэты вельмі проста,
І не патрэбна многа сіл.
Не прапускайце толькі тостаў
І не закусвайце зусім...

Мара бамжа

Вядуць размову два бамжы
На звалцы:
– Што б купіў, скажы,
Калі б ты меў мільён даляраў?
Здаецца, пра кватэру марыў...
– Не, у мяне другое ў марах:
Купіў бы звалку на Канарах!

РЭЗАНАНС

Жырыноўскі спрабуе схаваць патаемныя мары Крамля

Нядаўна небезвядомы Уладзімір Жырыноўскі ў чарговы раз звярнуўся да беларускай тэмы. Ён гучна абвясціў, што Расія мусіць цяпер трываць Аляксандра Лукашэнку на пасадзе прэзідэнта ў інтарэсах сваёй бяспекі, бо ў выпадку яго сыходу **"і Літва забярэ частку Беларусі, і Польшча забярэ, і Кіеў забярэ. Яе не будзе, Беларусі, – расцягнуць на кавалкі суседнія краіны"**.

Асабліва, канешне, уражвае ўкраінская агрэсія. Так і бачыш, як "бандэраўцы" кідаюць фронт у Данецку і Луганску і паўзуць праз прыпяцкія балоты, каб захапіць Пінск і Мазыр...

Хоць выказванне крамлёўскага рэтранслятара і ўражвае, але думка не новая. Яшчэ больш за дваццаць гадоў таму тагачасны прававерны беларускі палітык С.Касцян лямантаваў: *"Калі Польшча ўвойдзе ў НАТО, а яна ўвойдзе, мы можам пераўтварыцца ў польскія землі. Калі Беларусь не пажадае ўваходзіць у НАТО і будзе аказваць нейкае супраціўленне, Захад пойдзе на тое, каб справакаваць канфлікт на тэрыторыі Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, а потым, у абарону саміх грамадзян, увесці войскі НАТО"*. А зусім нядаўна нечым падобным палохаў беларусаў і Лукашэнка.

Заўважу: у свой час такія жахі найлепшым чынам пракаментаваў выбітны палітолаг, дарадца амерыканскага прэзідэнта Збігнеў Бжэзінскі: *"Любы разважны паляк разумее, што, калі Польшча будзе рухацца ў накірунку Гродна і Навагрудка, ёй хутка прыйдзецца развітацца са Шчэцінам і Вроцлавам"*. Адным словам, нам, беларусам, можна спаць спакойна, з польскага боку ніякай агрэсіі не прадбачыцца. А Лукашэнку патрэбны "ворагі" толькі для таго, каб збіць хваллю грамадскага абурэння брутальнымі фальсіфікацыямі падчас прэзідэнцкіх выбараў: маўляў, гляздіце, на нас ідуць вайной, краіна ў небяспецы, яе трэба ратаваць як толькі можна.

Што тычыцца Жырыноўскага, дык тут усё зразумела: злодзей заўсёды грамчэй за ўсіх крычыць "Трымай злодзея!". Ні для каго не сакрэт, што Масква сама марыць інкарпараваць Беларусь, прычым не частку, а цалкам. Між іншым, крыху раней гэты ж Жырыноўскі засведчыў: *"Апошняе, што павінен зрабіць Лукашэнка, пакуль ён прэзідэнт, – гэта звярнуцца да парламента Расіі, урада і прэзідэнта: прыняць Беларусь у склад Расіі"*.

Пры гэтым адыёзны лідар ЛДПР разумее, што любыя вольныя выбары ў Беларусі прывядуць сённяшні рэжым да канца. Але яго пужае, што тады пацярпіць і Расія, таму што да ўлады могуць прыйсці *"беларускія Гайдары, Навальныя, Хадаркоўскія"* і Расія атрымае тэрыторыю з непрымальнымі для яе прапагандай і паводзінамі.

Паколькі сам па сабе Уладзімір Вольфавіч абсалютна ніякай небяспекі не ўяўляе, на гэтыя глупствы можна было б не звяртаць увагі. Але справа ў тым, што раз-пораз менавіта ён агучвае намеры Крамля, якія той па нейкіх прычынах не жадае публічна кранаць сам.

Яскравы прыклад: не паспеў Жырыноўскі пашкадаваць, што ў нашай краіне няма ніводнай прарасійскай палітычнай партыі, як у Мінску адбылося пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па заснаванні палітычнай партыі "Саюз". Зразумела, што дадзеная структура атрымае магутную ўсебаковую падтрымку з Масквы, пры тым што ранейшага супраціўлення беларускай улады такім памкненням у цяперашняй сітуацыі чакаць ужо не выпадае. І якраз гэта можа аказацца сапраўднай пагрозай пры правядзенні новых выбараў.

На тле гэтага сур'ёзну занепакоенасць выклікаюць кантакты асобных прадстаўнікоў Каардынацыйнай рады у Маскве з мэтай памяняць расійскую грамадскую думку пра стан спраў у Беларусі і яе будучыню праз экспертную супольнасць. Праблема ў тым, што тыя тамтэйшыя эксперты, якія маюць хоць які-небудзь уплыў на расійскае кіраўніцтва (дарэчы, у любым выпадку зусім невялікі), самі ў той ці іншай ступені ёсць апантаныя імперскімі настроямі.

Адпаведна, вельмі наіўна чакаць ад іх чагосьці на карысць беларускай незалежнасці, у тым ліку за якую працягваюць змагацца на вуліцах сталіцы сотні тысяч грамадзян. Калі і ўзнікне пагроза для нашай краіны, то яна будзе сыходзіць не з Захаду, ак дэкларуюць Жырыноўскі і Лукашэнка, а менавіта з празіглагага боку – ад расійскай імперыі.

Міхась ІЛЬНІЦКІ, мінчанін.

ГДЕ ЭТО ВИДАНО...

Этому человеку вся милиция должна поклониться, а его бросили за решетку

С Сергеем Масловским я познакомился во время президентской кампании на одном из митингов, которые проводила Светлана Тихановская. Был удивлен, что бывший начальник ГАИ Миноблисполкома присоединился к волонтерам, помогающим претенденту на главный пост в стране от демократической общественности. Казалось, у человека неплохая пенсия, мог бы спокойно сидеть дома, ездить на рыбалку и оставаться в тени в это неспокойное время, но он, видите ли, решил бороться за честные выборы.



И вот результат. Его бывшие коллеги из правоохранительных органов «взяли на карандаш» С.Масловского, который и после выборов проявлял свою гражданскую активность. На одной из протестных акций Сергей был задержан.

И вот тут на него началось сильное давление. Как рассказали мне задержанные граждане, которых вместе с Сергеем доставляли в Жодинскую тюрьму, полковника милиции поставили на колени, связав руки сзади пластиковым жгутом. Он был единственный, кто ехал в такой позе. Сотрудники милиции высказывали ему свое негодование: мол, он предал их структуру.

14 октября судья суда Советского района г.Минска **Мария Фёдорова** вынесла решение о привлечении С.Масловского к административной ответственности, «наградив» его 15 сутками ареста, приняв за чистую монету слова некоего свидетеля Н.А.Бельского, который сказал, что Сергей, участвуя в марше, громко кричал «Жыве Беларусь!». Несмотря на то, что полковник ранее никогда не привлекался к административной ответственности, что он является пенсионером МВД, имеет ряд хронических заболеваний, продолжает работать, характеризуется положительно, судья Фёдорова, как видите, назначила ему довольно строгое наказание.

Били ли его в Жодино, нам не известно, но через какое-то время экстренная скорая помощь Сергея увезла в госпиталь МВД. Что с ним произошло, можно только догадываться.

Из ответа заместителя главного врача госпиталя МВД Е.А.Багрова стало известно, что Сергей был доставлен в связи с тем, что у него был гипертонический криз, невропатия лицевого нерва, он имел ряд других сопутствующих заболеваний. Кроме этого у пациента были установлены телесные повреждения в виде ушибов, гематомы обоих бедер и ссадины в области обоих лучезапястных суставов. Это и вызвало у родственников опасение, что Масловскому нужна помощь адвоката.

К сожалению, адвокат не смог попасть к Сергею, так как его из госпиталя этапировали обратно в центр изоляции правонарушителей, чтобы он отбыл оставшийся срок административного ареста. Вот наша действительность: все видят, что человек имеет ряд заболеваний, но никто его домой не отпускает. Хотя в административной практике вполне возможно такое, когда арест прерывается в связи с ухудшением состояния здоровья человека, но потом, когда ему станет лучше, он отсидит за решеткой оставшийся срок.

Замечу: за все время административного ареста адвокату так и не предоставили возможности встретиться с подзащитным. Это еще одна тема для разговора о соблюдении прав человека в нашей стране. Законно предоставляет человеку право встречаться со своим защитником в любое время без ограничений.

Мы ждали, что через 15 суток Сергей выйдет на свободу. Но тут на него завели новое административное дело, и вновь та же судья Фёдорова назначила очередные 15 суток ареста.

Понятно, что таким образом власти пытаются сломать человека, чтобы он в будущем не участвовал в протестах. Следует отметить, что С.Масловский из бывших милицейских сотрудников единственный, кто письменно обращался к министру МВД Караеву с требованием провести проверку по всем фактам избиения демонстрантов. Он же предлагал создать общественную комиссию в составе правозащитников. Но с ним министр не захотел встретиться.

Мы обеспокоены его состоянием здоровья. Сейчас Сергею нужна реабилитация в связи с перенесенными заболеваниями. Необходимо подать заявление в Следственный комитет о проведении проверки по факту получения им телесных повреждений, то есть необходимо срочно провести судебно-медицинскую экспертизу.

Вот настоящий офицер милиции, на которого надо равняться молодым сотрудникам правоохранительных органов! Даже после увольнения Сергей не остался равнодушным к любым проявлениям нарушения законности и правопорядка. В один из дней, будучи на автомобильном рынке, задержал преступника, который совершил грабеж и пытался скрыться с 10 тысячами долларов. Один, без поддержки он кинулся за ним в вдогонку, обезвредил и вернул деньги потерпевшим. Это настоящее мужество!

Вот таких принципиальных людей сегодня не хватает милицейскому ведомству. Думаю, что при новой власти у Сергея есть все шансы вернуться в правоохранительные органы и стать достойным министром МВД.

Олег ВОЛЧЕК, руководитель правозащитного центра «Правовая помощь населению» (зарегистрированного в Киеве), бывший следователь прокуратуры.

ХАЧУ СКАЗАЦЬ...

...А тыя сотні тысяч людзей, якія пратэстуюць супраць фальсіфікацый на выбарах, яны ж не з Луны зваліліся

Як можна весці размову пра прыняцце новай Канстытуцыі, калі А.Лукашэнка ўпарта, як сляпы і глухі, не хоча чуць народ Беларусі, з непавагай гаворыць, што "з вуліцай ніякага дыялогу не будзе"? А тыя сотні тысяч людзей, якія пратэстуюць супраць фальсіфікацый на выбарах, яны ж не з Луны зваліліся. Улады самі стварылі канфліктную сітуацыю ў такой ціхай і спакойнай краіне, як наша Беларусь.

Аляксандр Рыгоравіч, праявіце мужнасць, скажыце народу адкрыта, што выбары вы прайгралі. Аб гэтым сведчаць сотні, тысячы неабвержных фактаў.

Вольга Іванаўна ВАРАКСА, пенсіянерка. *Мінск.*

СТОП-КАДР

Навошта юнцоў кінулі ў пекла?



Паглядзіце, шаноўныя чытачы, на здымак. Звярніце ўвагу на вочы вось гэтага юнца з ружжом, які быццам узіраецца ў ахвяру. Хто, хто з высокага амапаўскага ці ваеннага начальства кінуў яго ў пекла? Якім ён выйдзе з яго, хто адкажа за яго паламаны лёс? Хлопцу, як бачна па яго ж вачах, адкрытаму выразу твара, псіхалагічнай і псіхічнай напружанасці, уся гэта "вайнушка" з народам, арганізаваная людзьмі пры ўладзе з вялікімі зоркамі на пагонах, страшэннай ранай адгукнецца ў жыцці.

Дык ці ж не час спыніць распачатую ў краіне вайну, якую многія сумленныя людзі ахрысцілі грамадзянскай?

БЛАГОРОДСТВО

Беларусь может гордиться Виктором Александровичем Снежицким!

Может, Виктор Александрович Снежицкий и не одобрит мое письмо в редакцию уважаемой газеты «Народная Воля», но я все же решил выразить ему признательность за гражданскую позицию. Многие руководители, политики и общественные деятели его уровня после 9 августа словно воды в рот набрали, ни слова ни полуслова о том, что стало твориться в стране. А Виктор Александрович, будучи ректором Гродненского медицинского университета и членом верхней палаты белорусского парламента – Совета Республики Национального собрания, на своей странице в Facebook написал: *«Дорогие друзья! Поддерживаю своих коллег-медиков и всех протестующих против насилия и задержаний. Кадры, свидетельствующие о жестоких избиениях демонстрантов, шокируют. Только народ Беларуси, его воля определит, как нам жить дальше»*.



Известный кардиолог, профессор, имеющий за плечами богатейший опыт и высокий авторитет как среди научной общественности, так и среди многочисленных пациентов, не стал молчать, когда развернулось повсеместное насилие со стороны силовиков против мирных, безоружных людей, протестующих против многочисленных фальсификаций при подсчете голосов на президентских выборах. Он публично выразил свою гражданскую позицию. И это, понятно, не понравилось в верхах. В сентябре ему пришлось покинуть должность ректора медицинского университета. Вместо него А.Лукашенко согласовал кандидатуру Елены Кротковой, которая не может похвалиться ни докторской диссертацией, ни профессорским званием. До этого она была чиновницей управления здравоохранения Гродненского облисполкома.

Чтобы понять, кого власть убрала с должности ректора медуниверситета, скажу: Виктор Александрович Снежицкий не только доктор медицинских наук, профессор, он еще член-корреспондент Национальной академии наук, является автором более 450 научных работ, в том числе 12 монографий, и 25 патентов. Что и говорить, для региона это знаковая личность.

Оставшись работать на кафедре в родной альма-матер, Виктор Александрович принял решение досрочно прекратить полномочия члена Совета Республики Национального собрания. Можно представить, что окончательно подтолкнуло его к такому шагу. Но на Национальном правовом интернет-портале вот уже которую неделю зарегистрировано постановление о том, что В.А.Снежицкий больше не является парламентарием.

Что ж, в это сложнейшее время, когда решается судьба страны, ее будущее, каждый делает свой выбор. Благодарно поступил Виктор Александрович Снежицкий. И я от души хочу пожелать ему всяческих успехов и крепкого здоровья в дальнейшей жизни. Беларусь может гордиться этим человеком!

Анатолий КУПРИЯНЕНКО.

З ПІСЬМА

На Усебеларускім народным сходзе павінен выступіць Віктар Бабарыка

Чуў, што пад старшынствам кіраўніка ўрада Р.Галоўчанкі рыхтуецца план правядзення так званага Усебеларускага народнага сходу. Калі ён адбудзецца, то я лічу, што ў ім павінен узяць удзел былы прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта Беларусі Віктар Бабарыка. І не проста ўзяць удзел, а выступіць з прамовай. Напярэдадні выбараў ён меў магчымасць праз інтэрнэт данесці свае думкі да шырокай грамадскасці. Заслугоўвалі ўвагі многія яго выказванні як наконт палітычнай сістэмы краіны, так і па вырашэнні праблем эканамічнага характару. Вось няхай ён выкажацца і з трыбуны афіцыйнага форуму.

І наогул, колькі можна такога чалавека трымаць за кратамі? Як, дарэчы, і многіх іншых палітвязняў.

Андрэй ЛІХАВЕЦ, выбаршчык.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
6 ЛІСТАПАДА 2020 г.

ТАМ, ЗА ОКЕАНОМ

Одна половина США ненавидит Трампа, другая – Байдена. Кто из них станет президентом?



Голосование в США 2020 года называют важнейшими выборами в современной истории страны. И дело не только в том, что нового главу государства выбирают во время глобальной пандемии коронавируса. Страна расколота как никогда: демократы и республиканцы не согласны по целому ряду важнейших вопросов, а на улицах который месяц полыхают расовые протесты. Судя по опросам, нынешнего, 45-го, президента Дональда Трампа ждет поражение. Однако ему пророчили провал и в триумфальном 2016 году, так что интрига будет сохраняться до последнего дня подсчета голосов.

За что выступают Трамп и его противник от Демпартии Джо Байден, кто их любит и ненавидит и чего стоит ждать после выборов, результаты которых вот-вот будут известны, – в публикуемом материале.

Корона для президента

На популярность Дональда Трампа, несомненно, повлиял коронавирусный кризис: США пострадали от COVID-19 больше, чем любая другая развитая страна. Почти 10 миллионов зараженных, более 240 тысяч смертей – эти цифры шокируют избирателей и неизбежно приводят к критике любой администрации, «в смену» которой допустили такое несчастье.

Трудно сказать, смогли бы американцы избежать столь тяжелой эпидемии, если бы у власти были демократы. Но действующий глава государства действительно жестоко ошибся в самом начале кризиса, усомнившись в эффективности масок и серьезности ситуации в целом – и это запомнили даже самые невнимательные. А тем, кто забыл, об этом постоянно напоминают: бывший вице-президент Джо Байден напрямую говорит, что Трамп *«не смог защитить нацию»*. Кроме того, лояльные демократам газеты старательно осветили момент, когда скептично настроенный лидер сам оказался в больнице, подхватив коронавирус SARS-CoV-2.

Главный инфекционист США Энтони Фаучи подчеркивает, что программа действующего президента направлена в первую очередь на сохранение экономики, а не на здоровье населения, как у его оппонента. Байден действительно предлагает именно такой план действий: расширить тестирование, увеличить доступ к медицинскому оборудованию и усилить роль федерального правительства, чтобы, например, обязать всех губернаторов штатов законодательно закрепить масочный режим. Он также хочет отдельно заняться проблемой этнических меньшинств – темнокожие американцы страдают от COVID-19 сильнее, чем все остальные.

Черным по белому

Расовый вопрос оказался для этих выборов едва ли не важнее коронавирусного: год эпидемии и изоляции стал одновременно годом самых крупных протестов в истории страны. Хотя большинство демонстраций были мирными, некоторые из них оборачивались столкновениями с полицией, погромами, поджогами и массовыми грабежами.

Электорат демократов, безусловно, сочувствует движению за права афроамериканцев, и Байден вряд ли мог бы проигнорировать этот вопрос в своей программе. Он предлагает новые благотворительные инициативы: субсидирование жилья для бедных семей, инвестиции в малообеспеченные сообщества (речь в первую очередь о меньшинствах) и государственную поддержку бизнеса, которым владеют чернокожие.

В то же время массовые протесты BLM пугают избирателей, особенно консерваторов. До двух третей населения некоторых штатов сообщают, что видят угрозу со стороны протестующих, а в преимущественно «белых» городах движение довольно резко осуждают. Трамп в такой ситуации не может пренебрегать своим основным электоратом и регулярно появляется на фоне флага «Тонкая синяя линия» – символа движения за права полицейских, которое левые активисты часто клеймят, называя «расистским» и авторитарным.

Хотя президент согласился на реформу полиции и выделил дополнительное финансирование «исторически чернокожим» колледжам и университетам, по поводу протестов он высказывается однозначно: необходимо поддерживать закон и порядок в стране. Много шума наделала и его реплика по поводу реакционного правого движения Proud Boys: выступая на дебатах, Трамп не стал публично осуждать уличных борцов с антифашистами. Прогрессивные медиа тут же обвинили главу государства в поддержке идеи расового превосходства белых.

В ксенофобии Трампа винят еще и в связи с мусульманами: въезд в США из ряда стран с преимущественно магометанским населением под запретом еще с самого начала его срока. Байден в предвыборных роликах уже пообещал, что в случае победы отменит эту меру в первый же свой день в Белом доме.

Полюса общественности

Другой важнейший пункт, по которому расходятся кандидаты, – налоговая политика. Отношение к разным имущественным слоям населения вообще одно из ключевых различий между республиканцами и демократами («красными» и «синими» – именно в такие цвета окрашивают штаты на карте голосования). Так, Байден обличает президента в том, что он управляет страной в интересах своего круга общения – то есть сверхбогатых.

В то время как Трамп снижает государственные поборы, пытаясь поскорее победить коронавирусный кризис, бывший вице-президент заходит с другой стороны. Он собирается повысить налоги для людей с высоким доходом, отменить трамповские льготы для крупных предприятий и начать за счет них больше тратить на социальные нужды. В программе демократа много того, что консервативные американцы называют «социализмом»: например, повышение минимального размера оплаты труда.

Перспектива платить больше налогов возмущает консервативных обывателей – в том числе из-за того, как «либерал» Байден намеревается ими воспользоваться. В его планах – расширение социальных трат: на образование и инфраструктуру, а также на медицину. Он собирается вернуть популярную программу всеобщей медицинской страховки Medicare, введенную 44-м президентом Бараком Обамой.

Кроме того, претендент от демократов стремится к однозначно нелюбимой средними американцами цели – к усилению профсоюзов. Байден хочет облегчить вступление в эти организации, регулярно досаждающие работодателям ради прав работников.

В начале президентской гонки, еще не став единственным кандидатом от своей партии, бывший вице-президент занимал скорее центристские позиции. Сейчас под давлением более «левого» крыла своей партии Байден транслирует весь набор ценностей «прогрессивного» американца: поддерживает государственную скупку автоматического оружия у населения, расширение законов против дискриминации ЛГБТ и возвращение трансгендеров на военную службу (служить им запретил не кто иной, как Трамп). Доходит до того, что политическая позиция демократа противоречит его собственной: хотя он сам, будучи католиком, настроен против абортов, в качестве кандидата в президенты он борется за лояльное к ним отношение со стороны государства.

Зеленый вопрос

Ключевое для многих избирателей расхождение – во взглядах Трампа и Байдена на экологические проблемы. В то время как последний поддерживает, как минимум на словах, переход на «полностью зеленую» энергетику, нынешний глава государства не верит в то, что климат меняется из-за деятельности людей. Он несколько раз колебался в своей оценке того, как человечество влияет на экологию, но в сентябре высказался решительно: у науки, по его мнению, нет четких доказательств серьезности этого влияния.

Отсюда следует и целый ряд политических решений Трампа, которые Байден клеймит как безответственные. Так, глава государства выступает за то, чтобы расширить добычу полезных ископаемых в континентальных водах США, продолжает выход из Парижского соглашения по климату и однозначно поддерживает фрекинг – опасный для экологии метод добычи углеводородов.

Представитель Демпартии же настроен противоположным образом: он предложил избирателям план, по которому потратит два миллиарда долларов на борьбу за полностью чистое производство. Он собирается вернуться в отвергнутое Трампом Парижское соглашение, так как не сомневается во влиянии загрязнения на состояние планеты.

Америка, война и мир

Это не единственная подобная инициатива Байдена: одна из его целей – вернуть внешнюю политику США в миролюбивое русло, выбранное еще Бараком Обамой. На практике это значит, что США под началом демократа вернутся во Всемирную организацию здравоохранения, из которой Трамп вышел со скандалом, а также переосмыслят трансатлантическое партнерство.

Оказавшись у власти, Дональд Трамп оказал серьезное воздействия на международную обстановку: он не только показал целой плеяде европейских национал-популистов, что националист (так американский президент несколько раз именовал себя сам) способен выиграть выборы в передовой стране, но и повлиял на рост их электората. Он заметно усилил давление на других членов НАТО по вопросу военных обязательств, тем самым напоминая странам об их национальных интересах.

В планах Байдена – более мягкая, лишенная постоянных угроз партнерам международная политика. Однако общий ее вектор поменяется вряд ли: он, как и Трамп, поддерживает примирение Израиля с арабскими странами, вывод войск из Афганистана и борьбу с Китаем. В том случае, если он победит, торговая война с КНР станет, вероятно, более предсказуемой – в том числе и потому, что вновь усилится связь Вашингтона с другими странами Запада.

Стоит отметить, что более сплоченные действия Европы и США вряд ли будут на руку современному российскому государству. Отсутствие разногласий между ними наверняка поможет усилить антироссийские санкции, а ослабление популистских партий в ЕС еще больше ослабит позиции Москвы.

Администрация Трампа поддерживает «отличные отношения» с российским руководством, хотя бы по собственным словам президента. В то же время Джо Байден, второе лицо Соединенных Штатов в течение всего украинского кризиса, вряд ли будет притворяться дружелюбным по отношению к России.

Впрочем, Россия – далеко не самая важная тема этих выборов. После того как основания для «российского дела» Трампа оказались очень сомнительными, американские избиратели вряд ли воспринимают всерьез угрозу со стороны Москвы. Их куда больше волнует победа их кандидата – ни одна сторона не верит, что противоположная поведет страну в нужном направлении. Так и выходит, что при любом исходе проиграет эти выборы примерно каждый второй американец.

Степан КОСТЕЦКИЙ.



СТАЛО ИЗВЕСТНО

В России завершились госиспытания нового ракетного комплекса



Испытания проводились на новейшем стелс-фрегате проекта 22350 «Адмирал флота Касатонов». Сейчас ведется подготовка технической документации, и до января 2021 года «Ответ» будет принят на вооружение. Этим комплексом будет оснащена большая часть надводных кораблей Северного флота.

Комплекс «Ответ» состоит из управляемой ракеты, которую можно запускать из универсальных пусковых установок 3С-14 наряду с крылатыми ракетами «Калибр», «Оникс» и «Циркон». Также к комплексу относится самонаводящаяся противолодочная торпеда, которая доставляется ракетой в зону атаки.

1 ноября стало известно, что на Северном флоте готовятся запустить гиперзвуковую противокорабельную ракету «Циркон» на расстояние около тысячи километров. Ракета должна будет поразить морской щит, имитирующий корабль противника. Всего до конца года будут проведены три испытательных пуска «Циркона».

В июне сообщалось, что российский фрегат проекта 22350 «Адмирал флота Касатонов», созданный по стелс-технологии, завершил морскую часть государственных испытаний и в ближайшее время будет включен в боевой состав ВМФ России. В ходе тестов на Балтике были испытаны все проектные характеристики корабля, работа систем и вооружения.

ЭВРИКА!

Эксперты: к 2025 году новые технологии вытеснят 85 миллионов рабочих мест

Из-за автоматизации в результате технологического прогресса к 2025 году могут быть сокращены 85 миллионов рабочих мест в 15 сферах экономики. Это следует из доклада Всемирного экономического форума (ВЭФ), опубликованного 20 октября.

Вместе с тем эксперты полагают, что «революция роботов» приведет к созданию 97 миллионов новых рабочих мест. В целом в будущем, в отличие от предыдущих лет, появление новых позиций будет происходить медленнее, чем исчезновение уже существующих, говорится далее в документе.

По оценке экспертов ВЭФ, к 2025 году работа будет распределена между человеком и машинами поровну. При этом автоматизация коснется таких видов деятельности, как ввод и обработка данных, бухгалтерский учет, ряд административных задач.

ПО-ЛЕ-ТИМ!

В Берлине открыт новый аэропорт: его называют «кладбищем миллиардов»



Открыл двери новый международный аэропорт Берлин-Бранденбург. Его строительство длилось 14 лет и стало одним из самых крупных скандалов в истории подобных проектов в немецкой столице.

Строительство аэропорта началось еще в 2006 году. Изначально планировалось, что аэропорт сдадут в эксплуатацию в октябре 2011 года. Но из-за различных технических и строительных недостатков, особенно в сфере пожарной безопасности, даты открытия BER отменяли и переносили в общей сложности шесть раз.

СЛЫШАЛИ?

В Москве появятся два новых железнодорожных вокзала

На территории Новомосковского административного округа столицы появятся два новых железнодорожных вокзала.

Один вокзал будет построен на Курском направлении железной дороги в Старосырово, между Щербинкой и Силикатной, другой – на Киевском направлении в Санино, между Кокошкино и Крекшино.

От них пойдут параллельные ветки дороги, для того чтобы увеличить количество электричек и сократить интервалы между временем прибытия. На этих линиях будут дополнительные станции.

Кроме того, у вокзалов построят транспортно-пересадочные узлы. Проект рассчитан на оптимизацию потоков жителей окраинных районов Москвы, которые едут в центр города.

СЛЫШАЛИ?

Экономика ЕС выросла за третий квартал на 12,1%

Экономика Германии, несмотря на пандемию коронавируса, выросла на 8,2%, в Италии ВВП увеличился на 16,1%, в Испании – на 16,7%, во Франции – даже на 18,2%. В результате рост в целом по Евросоюзу составил 12,1%, а в странах еврозоны достиг 12,7%.

Прогноз на четвертый квартал: минус возможен, но обвала не будет

К примеру, немецкое статистическое ведомство Destatis, перечисляя причины бурного роста немецкой экономики в третьем квартале, первым делом называет возросшие потребительские расходы населения, что наверняка отчасти связано с временным снижением НДС в Германии с 1 июля. Затем в сообщении указывается на инвестиции в оборудование и на рост экспорта. Так что, по мнению статистиков, в ФРГ в минувшем квартале ощутимые импульсы экономике давали все ключевые потенциальные драйверы роста.

В то же время практически все немецкие аналитики, комментируя итоги третьего квартала, сходятся на том, что неожиданно сильные показатели минувших трех месяцев в четвертом квартале уже не повторятся. Прежде всего из-за нового частичного локдауна в ФРГ, который вводится на месяц со 2 ноября, но также и из-за эффекта высокой базы.

«В текущем квартале можно рассчитывать разве что на маленький рост. Риск получить минус весьма высок. Но ни о каком обвале, как весной, уже и речи нет», – уверен главный экономист немецкого банка Bankhaus Lampe **Александер Крюгер**.

Учитывая большое значение немецкой экономики для европейской, такой прогноз можно, пожалуй, перенести и на весь Евросоюз, хотя и с определенными оговорками. Так, Центральный банк Франции уже предупредил, что в четвертом квартале по сравнению с третьим ВВП второй по величине страны ЕС, скорее всего, снизится. Но после рывка в 18 с лишним процентов, да еще и в условиях нового жесткого локдауна, ничего неожиданного в этом не будет. Экономический кризис в ЕС продолжается, но он, как стало теперь ясно, может оказаться не столь глубоким, как многие опасались весной.

СЛЫШАЛИ?

Александр Пласковицкий сутки провел в изоляторе временного содержания

В воскресенье 1 ноября экс-начальника главного государственно-правового управления Администрации президента задержали во время акции протеста.

«2 ноября вечером я вернулся домой, ибо карательский свидетель-фантазер не явился на суд, а судья (ужель юрист?!) не посмел длить задержание ни мне, ни моим как бы «подельщикам» из ИВС Минского района, – *рассказал «Народной Воле» Александр Пласковицкий.* – Ведь продолжение суда пришлось перенести на ***11 ноября***, а это все-таки не укладывается в законный максимум задержания (72 часа).

Сутки в изоляторе были очень интересными (даже слегка романтичными), в основном благодаря семерке моих сокамерников, отбывавших разные сроки и по разным поводам. Да и вообще там атмосфера почти домашняя. Зато хорошо видно, что беспредел нынче стал лишь слегка безумнее, то есть качественно не изменился при огромном количественном расширении.

Впрочем, густой поток высокообразованных посидельцев очень благотворно влияет на всех вокруг, в том числе и на тюремщиков…

А влип я по собственному ротозейству (слишком рано утратил бдительность). И еще потому, что уже постыдно слаб против кучи резвых и драчливых юнцов…

Но, как ни странно, даже злости стало меньше, а ведь боялся, что «взорвусь, как триста тонн тротила»…»

«Народная Воля» поинтересовалась, будет ли Александр Пласковицкий как-то особенно готовиться к суду? Пойдет один или с адвокатом? И не намерен ли он до часа икс покинуть эту прекрасную страну?

– Появление адвоката на процессах о протесте воспринимается сегодня как полное одобрение предъявленных «обвинений», – *говорит Пласковицкий.* – Это существенно ухудшает положение и «обвиняемого», и его защитников. Так зачем же дразнить гусей?! Буду продумывать убедительные доказательства того, что было на самом деле, и опровержения того, что вписано наспех в трафаретный протокол, составленный без моего участия. Однако же не уверен, что прибегну к подготовленным аргументам. По ходу процесса будет вырисовываться план. И тут уж придется помнить, что отстаивать правду бывает вредно и для правды, и для психики представителей судебной и правоохранительной системы. Меж тем некоторые из них и так бросаются на сограждан, как на своих злейших врагов. У нас продолжает чудить «превосходнейший» мастер стравливания людей. И я не хотел бы снова хоть в чем-то ему помогать, особенно в разжигании гражданской войны.



Желания покидать Беларусь никогда не было и, надеюсь, не будет. Как сказал А.М.Елин: «Ведь не может комфорт быть превыше любви. Так что там, где ты свой, – там борись и живи».

Марина КОКТЫШ.

ЖУРНАЛІСЦКАЕ РАССЛЕДАВАННЕ

«Якія наркаманы?! Нармальных людзей збівалі…»

Напэўна, многія бачылі кадры рэзананснага відэа, знятага ў адной са сталічных кватэр на вуліцы Нававіленскай, дзе 25 кастрычніка адбыліся жорсткія затрыманні тых, хто браў удзел у чарговым нядзельным маршы.



Калі на перасячэнні вуліц Арлоўскай і Нававіленскай пачалі ўзрывацца святлошумавыя гранаты, людзі сталі разбягацца па дварах і хавацца ў кватэрах. У адну з такіх кватэр забегла каля 20 чалавек, але за імі ўслед уварваліся сілавікі.

"Сюды ідзі! – кажа адзін з сілавікоў на відэа. – *Баб не чапаю, сказаў! Мужыкі выходзяць! (...) Я яго забяру з болем або без болю. Уставай!* (Раздаюцца гукі удараў і жаночыя крыкі.) *Прыбрала рукі! Газавы балончык дастаць ці што?"*

Пазней гэтыя падзеі пракаментаваў і Лукашэнка: *"Мэта была захапіць цэнтр – не пусцілі. Пайшлі на аддзелы міліцыі, пайшлі, што самае страшнае, у спальныя раёны. Цёмна, людзі перапужаныя. Хтосьці выйшаў з дзеткамі на вуліцу.*

Гэта што, нармальна, калі п'яны, ашалелы, праколаты наркотыкамі натоўп, пракураны і прапіты – сотні чалавек – рынуліся ў гэтыя раёны? Што трэба было рабіць міліцыі? Гэта быў мой загад, каб засцерагчы людзей. Пачалі ўскрываць кватэры, рынуліся туды, прыйшлося з кватэр выцягваць гэтых наркаманаў".

"Народная Воля" пагутарыла з відавочцамі таго, што адбывалася 25 кастрычніка на скрыжаванні вуліц Арлоўскай і Нававіленскай, а таксама з некаторымі "наркаманамі", якія аказаліся ў той самай кватэры.

Адна з тых, хто пасля разгону дэманстрантаў забег у кватэру на Нававіленскай, – Ірына (імя зменена). Маладая жанчына кажа, што была на маршы разам з мужам.

– Мы знаходзіліся нападалёку ад Цэнтральнага РУУС, на людзей пайшоў АМАП, – успамінае мая суразмоўніца. – У нейкі момант на дарогу паляцелі святлошумавыя гранаты, усе пачалі разбягацца хто куды. Убачылі адкрыты пад'езд – пабеглі туды. Перад намі ў гэты пад'езд забегла яшчэ процьма людзей, нас пераследавалі амапаўцы. На другім паверсе ўбачылі адкрытую кватэру, схаваліся там. Але дзверы не паспелі закрыць, уварваўся АМАП. Усяго на той момант у кватэры было каля 20 чалавек.

– Я упала на спіну, муж наваліўся на мяне, і мы паціху ў цемнаце папаўзлі да канапы, – працягвае жанчына. – Марыла толькі пра адно – каб у пакоі не ўключылі святло, але так і здарылася. Сілавікі ўбачылі мужчын, майму мужу адразу далі дубінкай па спіне. Праўда, некаторыя схаваліся – хтосьці ў шафе, нехта за пральнай машынай альбо канапай.

А пасля амапаўцы забралі з кватэры некаторых мужчын і пайшлі на вуліцу, дзе стаялі машыны, куді і змяшчалі пратэстоўцаў. А мы яшчэ каля паўтары гадзіны сядзелі ў гэтай кватэры, чакалі, пакуль усе раз'едуцца.

Ірына кажа, што там не было ніякіх алкаголікаў і наркаманаў, як затым гэта было прадстаўлена афіцыйнай прапагандай:

– Адна жанчына, можа быць, была крыху нападпітку, бо, як мне падалося, паводзіла сябе не вельмі адэкватна, але затым яна наогул кудысьці знікла. Усе астатнія былі абсалютна нармальныя людзі. Дарэчы, мы з мужам наогул не ўжываем алкагольныя напоі. А наркотыкі ніколі ў жыцці не спрабавала і не ведаю, што гэта такое.

33-гадовая Анастасія 25 кастрычніка таксама аказалася ў той кватэры.

– Хацелася хаця б з нагамі застацца, таму і пабегла, – кажа яна. – А ў дварах можна было лёгка пад гранату трапіць. Першай забегла ў пад'езд, пачала званіць ва ўсе кватэры. На другім паверсе дзверы адчынілі дзяўчаты, туды і схаваліся. А далей усё вядома: уварваліся сілавікі, выцягвалі хлопцаў. Я ў гэты момант схавала пад канапу тэлефон і бел-чырвона-белы сцяг, каб яны не дасталіся міліцыянерам у выпадку майго затрымання.

Двое хаваліся ў шафе, адзін за канапай. Некаторыя дзяўчаты былі моцна напалоханы. Камусьці зрабілася блага, давалі валяр'янку. Адна дзяўчына была алергікам, у яе пачаўся моцны прыступ кашлю, яна літаральна пачала задыхацца, і мы далі ёй фенкарол.

Побач са мной сядзеў хлопчык, якому на выгляд было гадоў 12–13, нават і не ведаю, як ён там аказаўся. Таксама быў моцна напалоханы, давялося яго супакойваць. А пасля прыехалі сябры і знаёмыя на машынах і пачалі нас развозіць па дамах.

Анастасія кажа, што ёй проста смешна чуць, што з кватэр *"выцягвалі наркаманаў"*.

– Абсалютна ўсе былі не наркаманы, цвярозыя. Асабіста я алкаголь не ўжываю, – кажа мая суразмоўніца. – Але разумею, дзеля чаго робяцца такія заявы, бо ўсё гэта ўжо праходзіла. Пасля выбараў 2006 года людзі таксама пратэставалі супраць сфальсіфікаваных выбараў, тады на плошчы нават утварыўся намётавы гарадок пратэстоўцаў. Была сярод іх і я, затым сядзела за гэта на "сутках". Тады ж таксама па БТ казалі, што ў тых намётах сабраліся прастытуткі і наркаманы, прапаганда паказвала нейкія міфічныя шпрыцы, не саромеліся хлусіць, што праплачаныя пратэстоўцы калоліся наркотыкамі. Тое самае адбываецца і зараз. Як бачым, за 15 гадоў нічога новага не прыдумалі, а таму ўключаюць старую пласцінку пра пратэстуючых "наркаманаў, алкаголікаў і прастытутак".

Той дом на Нававіленскай знайсці не вельмі складана. Дастаткова запытацца ў гэтым раёне пра падзеі 25 кастрычніка, і вам усё адразу раскажуць і пакажуць.

– Я ў той дзень дома была, але, калі пачаліся стрэлы і выбухі, выйшла на вуліцу, бо адпрацавала медыкам каля 30 гадоў, і, магчыма, камусьці спатрэбілася б мая дапамога, – кажа пенсіянерка Марыя Васільеўна, якая пагаджаецца на размову толькі пасля доказаў таго, што я працую не ў дзяржаўных СМІ. Паказваю рэдакцыйнае пасведчанне, жанчына працягвае: – Тут жа жудасць што рабілася! Людзей збівалі, ім пад ногі кідалі гранаты! І практычна ўсе жыхары дамоў у гэтым раёне адчынялі дзверы сваіх кватэр, каб схаваць людзей ад сілавікоў. Гэта хлусня, што былі наркаманы ці п'яныя. Я размаўляла з некаторымі ўдзельнікамі маршу і бачыла, у якім яны былі стане. Шок у іх быў, але не ад наркотыкаў і алкаголю.

У кватэры, дзе хаваліся каля 20 чалавек, нікога няма, а вось суседка Людміла Іванаўна добра памятае, што адбывалася ў той дзень:

– Калі на вуліцы пачалася страляніна, людзі пабеглі ў наш пад'езд, бо дзверы тут зламаны і ніколі не зачыняюцца. Выбухі былі такія, што я думала – дом развaліцца альбо вокны павылятаюць. У нас стары дом з блокаў, дык ён, як мне падалося, хадуном хадзіў. Я не ведала, куды мне схавацца.

Калі ў пад'езд забеглі амапаўцы, баялася, што мне дзверы вынесуць. І яны пры гэтым раўлі, як нейкія дзікія звяры. Пабеглі на другі паверх за людзьмі, там крыкі працягваліся, а пад маім акном трое сілавікоў збівалі аднаго хлопца, я ўсё бачыла. Хлопец крычаў, а затым перастаў, магчыма, страціў прытомнасць, але яны некуды яго пацягнулі. Слухайце, што за час такі? Гэта ж самыя сапраўдныя зверствы!

– Была заява, што тут бегалі наркаманы і алкаголікі…

– Якія наркаманы?! Нармальных людзей збівалі… Я ніводнага п'янага не бачыла. Увогуле, уся гэтая сітуацыя такая мярзотная! І самае галоўнае, што зараз тыя, хто пры ўладзе, мала кажуць, з-за чаго ўсё пачалося. А пачалося ўсё з-за хлусні падчас выбараў. І зараз дубінкамі хочуць вярнуць народную любоў.

***

Дарэчы, пасля публікацыі відэа за інфармацыю пра сілавіка, які пагражаў забраць людзей з кватэры "з болем або без болю", паабяцалі ўзнагароду ў 1400 долараў. Такую суму прапанавалі заплаціць падпісчыкі аднаго тэлеграм-канала. І амаль адразу з'явіліся звесткі пра супрацоўніка АМАПа Аляксея Т., хаця гэтая інфармацыя нікім не была пацверджана.

Мы паспрабавалі датэлефанавацца да гэтага чалавека, каб даведацца, ці сапраўды ён быў у той дзень у кватэры на Нававіленскай, хацелі пачуць яго версію таго, што там адбывалася. На жаль, на працягу ўсяго часу абанент скідваў званкі, а таксама заблакіраваў сваю старонку ў сацыяльнай сетцы.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.





ПАМЯЦЬ

Пасмяротнае «хрышчэнне» Змітрака Бядулі



Праз восем месяцаў пасля эксгумацыі ў горадзе Уральску (Паўночны Казахстан) прах класіка беларускай літаратуры быў нарэшце пахаваны на Усходніх могілках беларускай сталіцы. Увесь гэты час ніхто не ведаў, дзе знаходзіцца труна (пра гэта заклапочана пісаў у "Народнай Волі" за 19 мая Міхась Скобла ў сваёй калонцы "Непахаваны Бядуля"). Хоць пра саму эксгумацыю і дастаўку праху ў Беларусь падрабязна гаварылася на адмыслова скліканай у Музеі гісторыі беларускай літаратуры прэс-канферэнцыі яшчэ ў лютым. І вось, дзякуй Богу, усё праяснілася: парэшткі класіка дазволу быць пахаванымі чакалі ў Бабруйску, у праваслаўнай царкве.

З дазволам, як бачым, мінскія ўлады не спяшаліся. Спачатку меркавалася пахаваць Змітрака Бядулю на Вайсковых могілках, дзе знайшлі свой апошні спачын яго сучаснікі і паплечнікі па літаратурнай дзейнасці – Янка Купала, Якуб Колас, Кузьма Чорны, Міхась Клімковіч. Але могілкі тыя даўно закрыты для новых пахаванняў, і нават для Бядулі не было зроблена выключэння.

Месца знайшлося на не менш ганаровых Усходніх могілках. У самым, што называецца, "прэзідыуме" (помніцца жартоўная характарыстыка тых могілак, дадзеная Р.Барадуліным: "Справа – натхняльнікі, злева – апявальнікі"). Зрэшты, чым Бядуля горшы за хакеіста Р.Салея ці начальніка Беларускай чыгункі Я.Валадзько, на магіле якога рэйка ляжыць? Такой бяды, што жылі яны ў розныя эпохі і мелі розныя светапогляды. Раз "прысуседзіліся" на могілках, то неяк і "паразумеюцца".

Здзівіла мяне іншае – роля ў пахаванні Бядулі Праваслаўнай царквы. Як вядома, Самуіл Яфімавіч Плаўнік (такое сапраўднае Бядуліна імя) праваслаўным не быў, ён паходзіў з яўрэйскай сям'і, у юнацтве вучыўся ў хедэры і ешыбоце (яўрэйскіх духоўных школах), меркаваў стаць рабінам. Праўда, потым пад уплывам найперш газеты "Наша Ніва" стаў выдатным беларускім пісьменнікам.

Але ён ніколі не быў ахрышчаны ў праваслаўе. Ды і як падобнае хрышчэнне магло адбыцца ў часы ваяўнічага бязбожжа ў 1920–1930-я гады? Тады ахопленыя раздзіманым бальшавікамі атэістычным чадам пісьменнікі навыперадкі дэманстравалі свае антырэлігійныя погляды і тузалі Бога за бараду ўсім гамузам. Не адставаў ад таварышаў і Бядуля. Вось радкі з яго тагачаснай паэмы (1923): *"А Беларусь бязбожніцаю стала, / цвіце, расце партыйкай маладой, / глядзіць удаль – ў Еўропу капітала, / трасе сярпом і молатам з гразьбой…"*

Шчыра ці няшчыра гэта напісана – хай разбіраюцца даследчыкі. Мне, паўтараюся, незразумела другое – праваслаўнае адпяванне, праваслаўны крыж над магілай шаноўнага чалавека, які да праваслаўя мае гэткае ж дачыненне, як дуб у Белавежскай пушчы да месяца, – гэта што? Дзяржаўна-царкоўнае ўшанаванне ці знявага яго рэлігійных пачуццяў?

Так, ніхто не ведае, у якой веры памрэ. Але ў выпадку з Бядулем хіба былі нейкія сумненні? Можа, знойдзены ў архівах нейкія невядомыя грамадскасці дакументы? Наколькі я ведаю, царква раней у падобных выпадках праяўляла пэўную асцярожнасць. А тут раптам стала такой звышталерантнай? Што гэта азначае? Што ў Беларусі хутка застанецца толькі адна канфесія, і ўсіх будуць прымусова ў яе пераводзіць? Як таго Бядулю, якога БПЦ разам з Міністэрствам культуры вырашылі "ахрысціць" пасмяротна.

А яшчэ мяне абурыла, што класіка беларускай літаратуры Змітрака Бядулю (многія са школы помняць яго цудоўныя творы – "Пяць лыжак заціркі", "Салавей", "Пяюць начлежнікі") пахавалі пад рускамоўнай шыльдай. І гэта ўжо дакладна знявага памяці пісьменніка, чые ўсе творы напісаны на беларускай мове, якую ён лічыў найкаштоўнейшым скарбам беларускага народа.

Нашаніўскі першапраходзец, які шчыра прыняў беларушчыну ўсёй душой, Змітрок Бядуля праз 78 гадоў пасля смерці (яна надышла ў 1941-м, падчас паспешнай эвакуацыі) нарэшце вярнуўся на радзіму з далёкай чужыны. Паводле слоў сына пісьменніка, спробы перавезці прах бацькі рабіліся і раней. Ды ўсё нешта перашкаджала. І вось – атрымалася. *"Застанецца на роднай зямлі грудок, застанецца на роднай мове радок"* (Г.Бураўкін).

Але калі ўжо мы навучымся нашых выдатных дзеячаў ушаноўваць, не зневажаючы?

Антон ЗАГОРСКІ.

ЗАКУЛИСЬЕ

Нина Ломанович: «Себя не бережете - подумайте о других

В Большом театре карантин, но – только для нас, зрителей. Сотрудники театра по-прежнему приходят на работу, тем более что творческий коллектив готовит к концу ноября премьеру оперы Ш.Гуно «Фауст». А как же ковид? Он что, обходит стороной историческое здание на Троицкой горе? Место, конечно, намоленное, но ведь не настолько… Мы связались с руководителем хора народной артисткой **Ниной Иосифовной ЛОМАНОВИЧ**. Она не стала скрывать, что две трети ее музыкантов переболели легочной инфекцией. Некоторые по второму разу, призналась главный хормейстер.

– До сих пор две певицы в стационаре, остальные на домашнем лечении, так как ковид у них проходит в легкой форме. В общем, сейчас 20 человек из хора на больничном, но надеемся, что к премьере «Фауста» люди придут на работу, так как болеют они уже давно. Перенесла ковид и я.



– Как протекала у вас болезнь, можно спросить?

– Два дня высокая температура, болела голова, тошнило. Запахи я тоже перестала слышать. Но ни кашля, ни насморка не было. Я сразу сама решила принимать антибиотики, еще до назначения врача, которого вызвала только через два дня, после выходных. Температура, конечно, вскоре упала до 35 градусов. Наступил полный упадок сил… Было тяжело, хотя врачи определили, что у меня ковид прошел в легкой форме. Но две недели болезнь у меня забрала, как говорится, не спрашивая. Кстати, у нас в хоре в основном люди в легкой форме болели. Многие перенесли инфекцию еще летом.

– То есть повторного заражения вы уже не опасаетесь?

– Опасаемся всего, инфекция агрессивная, легко проникающая. Поэтому больших репетиций не проводим, работаем малыми группами: вызываю музыкантов на работу по голосам, чтобы рассадить их вдалеке друг от друга: сначала сопрано, потом альты и так далее.

– Помогает? Пение – это ведь большой направленный поток воздуха.

– Поем в масках! Маски берем пошире, чтобы в рот не залипали.

– Считаете, что маска спасает?

– Да, маска и расстояние. Впрочем, хотя я как дирижер всегда стою на удалении от хора, все равно ведь подхватила инфекцию. Не зря врачи говорят: «Все переболеют!» Возможно, это случилось в транспорте – люди там ездят в основном без масок, видели? Я бы посоветовала государству применять к таким драконовские меры, сильно штрафовать. И не надо миндальничать с безалаберными гражданами. А то еще услышишь порой от пожилых безответственное: «Ай, я уже пожила, мне ковид не страшен!» Себя не бережете – подумайте о других. Вы видели врачей в стационаре? Они еле ходят от перегрузок, каждый день в больницы поступают сотни новых заболевших. Я просто перестала пользоваться общественным транспортом, если вижу, что там едет много людей.

– Ну, теперь у вас есть антитела, можно вздохнуть спокойнее.

– Представьте, нет антител. Недавно делала анализы… После легкой формы, говорят врачи, они вырабатываются не сразу, а через пару недель. А это время немалое, и ты перед инфекцией снова голенький, ничем не защищен.

– Так может, лучше не петь, не ходить на работу?

– Самое главное – не впадать в панику. Других советов дать не могу.

Елена МОЛОЧКО.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Глава стачкома «Белкалия»: «Мы намерены идти до конца»

Председатель стачечного комитета «Беларуськалия» **Анатолий Бокун** рассказал, что в стачке участвуют около 60 человек, 20 из них присоединились за последние две недели.

– Идеологи с тех участков, где люди уходят в стачку, пишут объяснительные и, наверное, тоже скоро придут к нам.

О масштабах итальянской забастовки можно только догадываться, она не заканчивалась, добавил Анатолий Бокун.

– Вы отсидели 55 суток. Ваш коллега Юрий Корзун, который приковал себя наручниками к горно-шахтному оборудованию, отбыл 30 суток ареста. Активист стачкома Павел Пученя отсидел 40 суток с середины сентября. Кто-то из них покинул стачком?

– Нет. Все на месте и намерены идти до конца. Нас поддерживают все жители нашей страны и зарубежья. Более 6000 писем со всего мира с требованиями прекратить беспредел пришли начальнику Солигорского РОВД.

– Не было ни одного видео с участием вас и ваших коллег по стачкому, где вы бы каялись перед властью за то, что присоединились к стачке. Как так получилось?

– Я находился в четырех ИВС (Солигорск, Любань, Узда, Старые Дороги). Разговаривал с сотрудниками милиции, разъяснял нашу позицию, что это не проплаченное мнение, это истинная воля народа и рабочих. И я хочу сказать, что милиция во всех ИВС с народом.

Накануне в разговоре со **Светланой Тихановской** представители стачкома «Беларуськалия» рассказали, что руководство пытается заглушить протест повышением зарплат и премий, несмотря на то, что план на сентябрь-октябрь предприятие не выполнило.

(«Солидарность».)

И СМЕШНО, И ГРУСТНО

Вместо счастья – опять опыт

4 ноября группа солигорских медиков провела акцию в знак солидарности с коллегами других городов, которых власти преследуют за их гражданскую позицию. В этот же день в Солигорске был задержан заведующий отделением Республиканской больницы спелеолечения, врач-терапевт **Евгений Беньковский**. Суд определил доктору наказание в виде штрафа в размере 20 базовых величин.



По местным соцсетям разлетелся его ироничный комментарий по этому поводу: «Всю жизнь ищешь счастье, а находишь опыт. Иногда думаешь: вот оно, счастье! Глянул ближе – а нет, опять опыт!»

Вера БРУЙ.

БЫЛЬ

АГІТАТАРЫ

Назва вёскі Лесніца ад слова “лес”. Сёння гэта з два дзясяткі хат, кінутых на ўскрайку лесу – Гродзенскай пушчы. Самыя старыя жыхары яе сцвярджаюць, што яшчэ ў часы іхняй маладосці можна было з вёскі дайсці аж да Вільні, не выходзячы з лесу. Спакон веку лес даваў вяскоўцам бярвенні на хаты, карміў дзічынай, ягадамі, грыбамі. Лясныя балоты нарадзілі для іх рачулку-ручай, куды нават фарэль заходзіла з Нёмана. За стагоддзі людзі распрацавалі тут надзелы пад поле, мелі сенакосы, пабудавалі на сваёй рачулцы млын. Жылі, як жывуць тысячы беларусаў у сотнях сваіх вёсачак.

Але мела вёска Лесніца адметнасць ад шэрагу навакольных: ніколі не была яна калгаснай, ні адзін вясковец тут ніколі не назваў сябе калгаснікам. Як ні намагалася Савецкая ўлада – не здолела далучыць вёску да шчаслівага калгаснага жыцця. А намаганні такія былі, і пра тое распавёў мне неяк адзін тутэйшы дзед.

Калектывізацыя ў заходніх раёнах Беларусі распачалася даволі позна, дзесьці на рубяжы саракавых-пяцідзясятых гадоў. Варта адзначыць, што спробы стварыць тут калгасы мелі месца і напярэдадні Айчыннай вайны, але тады яны так і засталіся спробамі. А вось цяпер, праз дзесяцігоддзе, за справу ўзяліся грунтоўна. Ужо выпалілі гарачым жалезам былых паліцаяў, уласаўцаў, іншую брыдоту, ужо прайшліся густым грэбенем па кулаках і падкулачніках, ужо ўзялі на карандаш тых, хто не захацеў зразумець і прыняць грандыёзныя памкненні партыі Леніна–Сталіна. І калі прасторы для новага жыцця былі расчышчаны, пачалі складаць спісы калгаснікаў.



Упаўнаважаны райкама ў суправаджэнні двух узброеных чырвонаармейцаў на канфіскаванай брычцы матаўся па наваколлі, займаўся справай. Агульных сходаў не праводзілі. Сяляне ўжо чулі, што такое калгасы, ставіліся да іх як да вялікай бяды, і пераламаць іх у гурце было складана. Тактыка была іншай: ад гаспадара да гаспадара, з хаты ў хату. ПрыцісНуць, запалохаць… І, варта адзначыць, яна давала плён. Вёска Лесніца чакала сваёй чаргі.

І вось у прызначаны дзень і час упаўнаважаны са сваёй аховай і парачкай актывістаў з сельсавета з’явіліся ў вёсцы. Але ў першым жа двары іх чакала неспадзяванка – на дзвярах хаты вісеў замок. Гаспадар, далёка не самы багаты ў вёсцы селянін Зміtрук, загадзя схаваўся ў лесе.

– Што? Сабатаж?! – зароў упаўнаважаны і са злосцю ляснуў у дзверы абцасам бота.

Замок, што не быў зачынены на ключ і вісеў проста так, для блізіру, адскочыў. Мацюкаючыся на чым свет стаіць, упаўнаважаны рвануў дзверы і ўваліўся ў хату. Некаторы час адтуль чуліся толькі лаянка, трэск, гром. Вось зазвінела шыба ў акне, і адтуль паляцелі сякера, вядро, гаршчок. Пырскаючы на ўсе бакі смятанай, збанок гопнуўся аб камень у двары.

– Я гэтае асінае гняздо выкуру! – чулася з хаты. – Усё паб’ю! Усё патрушчу! На Котласе яму ўжо нічога не спатрэбіцца!

– Запішы, Раман, гэтага Змітрука на высылку, – звярнуўся ўпаўнаважаны да аднаго з актывістаў, выйшаўшы з хаты. – З бліжэйшай жа партыяй паедзе.

Вяскоўцы, што назіралі са сваіх двароў за працэсам калектывізацыі, пырснулі па хатах. Жудаснае слова “Котлас” ім ужо было вядома. Гэта з Котласа яшчэ мінулай восенню нейкім дзівам уцёк сын сасланага туды з сям’ёй лесніка з Чарнушак. Юнак неяк дабраўся да родных мясцін і шмат чаго жудаснага распавёў землякам. І цяпер яны адчулі сябе перад калектывізацыяй бездапаможнымі, як перад верхавым пажарам. Кожны з іх сядзеў у сваёй хатцы і пакорліва чакаў лёсу.

А лёс у вобразе ўпаўнаважанага нахабна ўвальваўся ў чарговы двор і найперш заходзіў у хлеў, перапісваў каня, карову, свіней – што бачыў. Потым ішоў у хату, дзе гаспадар дрыжачымі рукамі падпісваў паперы, адракаючыся ад свайго надзелу, маёмасці, адракаючыся ад сябе. З крывой усмешкай упаўнаважаны віншаваў чарговага калгасніка з далучэннем да новага жыцця і ішоў далей. Справа рухалася да завяршэння.

Гаспадарка Лявона знаходзілася крыху наводшыбе, і таму калектывізацыя дайшла да яе ўжо недзе пасля поўдня.

– Яшчэ адзін кулак недабіты! – прамармытаў упаўнаважаны, падыходзячы да дбайна ўладкаванага плоту і дагледжанага садка наўкол хаты, перасмыкаючы кабуру з наганам на поясе.

Лявон лічыўся ў вёсцы чалавекам неблагім, але зухаватым, цёртым і нават бітым жыццём. Паводле чутак, знаўся і з паліцыяй, і з міліцыяй, і з партызанамі, і з бандытамі, але заўжды сваім розумам жыў. Вось і зараз ён з жонкай, абодва апранутыя па-святочнаму, са шчырымі ўсмешкамі на тварах сустрэлі камісію ля веснічак.

– А мы ўжо баяліся, што міма пройдзеце! Заходзьце, заходзьце, дарагія таварышы! Заходзьце прама ў хату.

Крыху збіты з панталыку гэтай нечаканай гасціннасцю, упаўнаважаны затаптаўся на месцы, імкнучыся ўсё ж да хлява.

– Што ж вам, таварыш начальнік, боты ў гной пэцкаць. Я сам жывёлу на двор выведу. Найперш паперы напішам, і, далібог, выведу, – завіхаўся каля начальства Лявон.

Ён далікатна крануў упаўнаважанага за лакаток і пацягнуў у хату.

У хаце гасцей сустрэў гаршчок з бульбай на стале. Бульба была шчодра паліта засмажаным салам з цыбуляй і пахла так, што ў галодных членаў камісіі закруцілася ў галаве.

– А мы во толькі абедаць сядалі, – паведаміў Лявон. – Дык і вы, таварышы, мо з намі перакусіце? Чым, як кажуць, багаты.

І прыкрыкнуў на жонку:

– Ну, чаго стаіш? Давай посуд, бачыш – таварышы галодныя ды і змучаныя, цалюткі дзень па хатах ходзячы.

Тая страпянулася, і ўжо праз імгненне на стале з’явіліся талеркі, лыжкі, відэльцы. Да бульбы далучыліся міса квашанай капусты з кроплямі журавін у ёй, патэльня з яечняй, вяленая хатняя каўбаса з таго самага дзіка, што пару тыдняў таму неабачліва трапіў пад паляўнічую карцеч.

Але, перш чым уладкавацца за сталом, упаўнаважаны цыкнуў на чырвонаармейцаў:

– А вы чаго губу раскаталі? Марш на вуліцу, глядзець адзін управа, другі ўлева.

– Ну, за поспех нашай справы! – усклікнуў Лявон, калі ўсе нарэшце расселіся на лаўках вакол стала.

У спрытных яго руках аднекуль з’явілася бутэлька, булькаючы, разышлася па шклянках гарэлка.

– За неўміручую справу Леніна–Сталіна! – выгукнуў тост упаўнаважаны.

Выпілі.

– За светлы шлях калгаснай вёскі! – быў наступны тост.

Выпілі.

Дзесьці пасля трэцяй ці чацвёртай Лявон падсеў да ўпаўнаважанага:

– То можа, хай бы хлопцы-салдацікі зайшлі перакусілі. Галодныя таксама ж. А “лясныя” ўдзень сюды не сунуцца, дый далёка яны, аж за Масцішчам дзесьці, кажуць, ашываюцца.

Упаўнаважаны, што ўжо расшпіліў верхнія гузікі свайго афіцэрскага кіцеля, махнуў рукой:

– Хай заходзяць.

Хлопцы нясмела зайшлі, прыселі. Ад прапанаванай гарэлкі адмовіліся. Лявон здагадаўся, абышоў стол з іншага боку і адцягнуў увагу ўпаўнаважанага на сябе. Чырвонаармейцы махнулі па паўшклянкі, закусілі, павесялелі.

Упаўнаважаны зароў песню:

Там вдали, за рекой…

Сельсавецкія актывісты падцягвалі. Лявон, блытаючы словы, далучыў свой дыскант да хору. Гаспадыня шайтанам лятала па хаце, і на стале з’яўляліся то смажаная качка, то шчупак, што яшчэ мінулай ноччу здуру заблукаў у нераце.

Лявон выстаўляў бутэлькі.

Упаўнаважаны абдымаў яго за плечы.

– Ты – наш чалавек! Я цябе старшынёй зраблю, партыйным будзеш!

Прыадчыніліся дзверы, і ў шчыліну зазірнуў Змітрук. Лявон выйшаў да яго.

– Ратуй, братка! – заскуголіў той. – А што, калі і насамрэч на той Котлас вывезе!

– Не трасіся да часу. Нясі свой самагон, бо ў мяне да рэшты ідзе. Цягнуць бальшавікі, як цэмент ваду, і не п’янеюць падлы.

– Я ўмомант злётаю, – абнадзеіўся Змітрук, – у мяне пяршак – на пальцы гарыць, хоць бальшавіка, хоць д’ябла табе зваліць.

Калі Лявон вярнуўся ў хату, яму насустрач устаў з-за стала чырвонаармеец, той, старэйшы, з вусікамі.

– Пайшлі, гаспадар, пакурым.

– Палі тут, – шырока махнуў рукой Лявон.

– Не. Пайшлі, – настойваў хлопец.

Яны выйшлі за хлеў пад яшчэ голыя з зімы яблыні. Запалілі цыгарэты. Некалькі хвілін стаялі моўчкі.

– Як вы жывяце! Ты сам не разумееш, як вы жывяце! – з тугой не вымавіў – прастагнаў чырвонаармеец. – Знішчыць усё! Усё знішчыць! Вас знішчыць!

– Хто знішчыць?

– Калгас знішчыць. Гола, боса будзе, як у нас. Трымайцеся, браткі! Хоць вы не дайце хамут на сябе надзець. А мы прапалі. Прапала Расея!

– Расея вайну выйграла, – дыпламатычна запярэчыў Лявон.

– Выйграла, а якім коштам? Па трупах, па крыві ішлі. Волю на штыках прыгнечанаму пралетарыю неслі. А ці запытаўся хто ў таго пралетарыяту, ці патрэбна яму такая воля?

Размова была небяспечная. “Мо знарок завёў гэту гаворку хлапчына? Мо прыдурваецца, выпытаць што хоча? – падумалася Лявону. – Не, у голасе горыч і боль. Шчыра. Відаць, таксама дапякло”.

– А сам ты скуль будзеш? – спытаўся ён у хлопца, каб хоць неяк адысці ад тэмы.

– Тамбоўскія мы, – глуха адказаў той, – бацьку, брата старэйшага майго газам стравілі.

Лявон спачувальна ўздыхнуў, зацягнуўся цыгарэтай.

– Нічога мы, братка, тут не зробім, толькі лбы паразбіваем. Пойдзем лепш у хату.

Змітрук са сваімі бутэлькамі быў ужо там, ды не адзін. Яшчэ некалькі суседзяў са сваім пітвом ды закуссю далучыліся да мерапрыемства. Баль загудзеў з новай сілай, быццам той лясны агонь, што дабраўся да ельніка.

Упаўнаважаны пачаў нарэшце здаваць. Ён яшчэ славіў у прамовах сваіх таварыша Сталіна, але цяпер выходзіла так, што ён, упаўнаважаны, быў з генералісімусам нароўні і без яго, упаўнаважанага, згоды высокія рашэнні не прымаліся і Зямля не круцілася. Сяляне слухалі яго з дэманстратыўным захапленнем. А потым усё патанула ў тумане.

Прачнуўся ўпаўнаважаны раніцай наступнага дня на гаспадарскім ложку, разуты і дбайна ўкрыты кажухом. Ён рыўком падняўся, лыпаючы вачыма, абвёў пакой. Абодва чырвонаармейцы сядзелі ўжо на лаўцы, гаспадары таксама былі тут. Сельсавецкія распаўзліся па хатах яшчэ ўчора. Упаўнаважаны кульнуў паднесеную гаспадыняй апахмельную чарачку і пачаў прыходзіць да цямы. Нешта раптам ўспомніўшы, ляпнуў далонню па кабуры. Кабура былы расшпілена і пустая. Зрэагаваць на прапажу начальнік не паспеў. Лявон маланкай кінуўся да печы і падаў упаўнаважанаму яго наган на раскрытай далоні.

– Муляў ён табе, таварыш. Дык ты яго пад ложак і кінуў. А я яго на печ у сухое пераклаў.

Пасядзеўшы яшчэ колькі імгненняў, упаўнаважаны разгарнуў свой планшэт з дакументамі і раптам падняў на прысутных вочы, у якіх былі гнеў, разгубленасць і страх.

– Паперы… Паперы дзе? – прасіпеў ён.

І Лявон, і чырвонаармейцы, пабялелыя, выцягнуліся перад ім на “зважай” і маўчалі.

І толькі гаспадыня тонам, якім размаўляюць з дзіцём, патлумачыла:

– Дык ты ж, паночак, сам учора калгас распусціў і спісы сам падраў ды людзям на самакруткі раздаў.

І паказала вядро са смеццем, дзе і сапраўды бачна была жменя недакуркаў з пісчай паперы.

Начальнік ледзь не хвіліну апупела глядзеў на прысутных, потым накінуўся на салдацікаў:

– А вы?! Куды вы глядзелі?

– Запынялі вас хлопцы, – падала голас гаспадыня, – дык вы ж крычалі дужа, лівальвертам пужалі, ледзь бяды не нарабілі.

Па ўсім відаць, упаўнаважаны і сам нешта пачаў прыпамінаць з учарашняга, бо таропка нацягнуў боты і выбег з хаты. Там ускочыў у бырчку (конік, накормлены і запрэжаны, ужо чакаў) і лупцануў лейцамі, пакінуўшы чырвонаармейцаў у хаце. Але праз нейкія паўгадзіны вярнуўся, набычыўшыся, зайшоў у пакой, буркнуў салдацікам:

– А вы чаго расселіся? Паехалі.

Больш гэтага ўпаўнаважанага сяляне ў вёсцы не бачылі. Не сустракалі і ў раёне. Ды, зрэшты, лёс яго мала каго цікавіў. Быў іншы клопат: пасля скандальнай няўдачы раённае кіраўніцтва не пакідала спроб завяршыць калектывізацыю. Але ледзь толькі чынавенства ўжо цэлым гуртам з’яўлялася ў вёсцы, людзі збягаліся з крыкамі: “Мы ўжо запісваліся!”, “Колькі ж можна?”, “Не будзем!”, “Не пойдзем!”, “Калі на Котлас – вязі ўсіх!”.

І не запісаліся, ні адзін. Нават калі абрэзалі зямлю, як кажуць, па вокны. Нават калі пазводзілі з двароў коней ды кароў. Хтосьці знайшоў заробак у лясгасе, хтосьці ўладкаваўся на чыгунку, хтосьці дабіраўся на працу за шаснаццаць кіламетраў у горад. Найбольшыя адчаюгі распачалі небяспечную, але прыбытковую справу – сталі прафесійна гнаць самагон. Не прапалі. Раённае чынавенства ж ужо адрапартавала наверх аб стопрацэнтнай калектывізацыі і падымаць цяпер залішні шум збаялася. І пра непаслухмяную вёску “забыліся”.

М.НЕЎГЕНЬ.

Вёска Гожа Гродзенскага раёна.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Когда в Минск приедет американский посол?

*«Народная Воля» уточнила в Посольстве США в Беларуси, когда в Минск должна прибыть Чрезвычайный и Полномочный Посол США **Джули Фишер**. И, если США не признают результаты выборов в Беларуси, кому посол Америки будет вручать верительные грамоты?*

В начале сентября заместитель помощника госсекретаря США по делам Европы и Евразии **Джордж Кент**, выступая на видеоконференции, организованной Германским фондом Маршалла в Вашингтоне, сказал: кандидат на должность американского посла в Минске Джули Фишер после возможного одобрения Сенатом Конгресса США приступит к своим обязанностям в кратчайшие сроки.

«Мы с нетерпением ждем голосования по утверждению кандидатуры моей коллеги Джули Фишер, а в случае одобрения – ее скорейшей поездки в Минск для выполнения обязанностей посла США», – сказал Кент.



В конце сентября комитет Сената США по международным делам утвердил кандидатуру замгоссекретаря Джули Фишер на должность посла в Беларуси, трансляция заседания велась на сайте комитета. Теперь кандидатуру Фишер должен одобрить полный состав Сената, где большинство у однопартийцев выдвинувшего ее на этот пост президента Дональда Трампа – республиканцев.

Джордж Кент прокомментировал критику со стороны сенаторов, считающих, что сейчас ни в коем случае нельзя отправлять в Минск американского посла. «*Мы определенно видим необходимость в наличии сейчас посла США в Минске*, – сказал он в начале сентября. – *События последнего месяца подчеркивают, что нам важно иметь голос и работать с этой страной*».

Напомним, что после дипломатического скандала в 2008 году Минск и Вашингтон на взаимной основе отозвали послов и до минимума сократили численный состав диппредставительств. Отношения между США и Беларусью потеплели после президентских выборов 2015 года. В 2019 году стороны заявили о возможности возвращения послов. В начале мая текущего года Трамп выдвинул кандидатуру Фишер на должность посла в Минске. 20 июля президент Беларуси А.Лукашенко назначил послом нашей страны в США заместителя министра иностранных дел **Олега Кравченко.**

Может, уже есть хотя бы предварительные сроки, когда Джули Фишер должна приехать в Минск? И кому посол Америки будет вручать верительные грамоты? Эти вопросы «Народная Воля» адресовала американскому посольству.

«Посольство США в Минске не предоставляет комментария на ваш запрос», – ответил «Народной Воле» первый секретарь посольства США по информации, образованию и культуре **Ли МакМэннис**.

Марина КОКТЫШ.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Нужна ли самоизоляция после возвращения с Занзибара?

«Сегодня некоторые туристические фирмы предлагают отдохнуть на волшебных пляжах Занзибара. А нужна ли будет по возвращении в Минск после такого отдыха самоизоляция? Как узнать?»

Ирина СИДОРЕВИЧ, Минск.

Вот как на этот вопрос отвечает директор турфирмы «Альтус тур» **Юрий Блажевич**:

– Туристам, путешествующим на Занзибар, для прибытия в Танзанию тесты на COVID-19 сдавать не нужно. Однако поскольку вы летите туда и обратно через территорию Украины, то по возвращении в Беларусь для вас предусмотрена самоизоляция.



Обратите внимание: в стоимость тура на Занзибар в числе прочих услуг входит обязательный ПЦР-тест по возвращении с отдыха. Его у вас возьмут в украинском аэропорту. Сертификат с результатом теста вам выдадут на месте либо пришлют на электронную почту в течение суток.

В соответствии с постановлением Министерства здравоохранения от 08.05.2020 №49 «О продлении (сокращении) сроков пребывания граждан в самоизоляции», в случае, если ваш тест отрицательный, вы можете обратиться с сертификатом в поликлинику по месту жительства с просьбой отменить самоизоляцию.

В случае отмены для вас самоизоляции сотрудники поликлиники должны уведомить об этом вас и тех, кто должен контролировать соблюдение вами правил карантина.


Галина РУТ.

ШЛАГБАУМ

Денис Дудинский на сцене Современного художественного театра пока не появится

Дело в том, что спектакли Современного художественного театра отменены до 18 ноября.

«Дорогие друзья, еще раз простите!.. – извинился перед публикой бывший телеведущий. – *Но спектакли театра СХТ на ближайшее время отменяются... Почему? «Ну вы же сами всё понимаете...» Большое «спасибо» важным и серьезным людям из кабинетов, управлений, инстанций, министерств, которые и определяют, кому можно, а кому нельзя. Будем надеяться, что, получив все возможные и невозможные разрешения, дозволения, позволения, удостоверения, унижения, оскорбления, мы снова выйдем на сцену. Давайте, до новых встреч!»*



Как выяснилось, управление культуры Мингорисполкома два дня назад за три часа до спектакля затребовало документы, разрешающие проведение культурных мероприятий. В театре говорят, что занимаются подготовкой необходимых бумаг. А билеты на несостоявшийся спектакль будут действительны на тот день, когда возобновится работа театра.

Современный художественный театр открылся в 2004 году. Основателем и художественным руководителем является театральный продюсер и актер **Владимир Ушаков.**

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

БУДЬТЕ ЗДОРОВЫ!



«Заболели не только мы, но и приглашенные...»

Солист группы Litesound Дмитрий Карякин уже несколько дней болеет коронавирусом.

«Валяюсь пластом из-за ковида, – *говорит артист*. – Нарушил режим изоляции, которому следовал полгода. Нас попросили, и мы согласились помочь – приняли участие в концерте «Битлз» на беларускай мове» 22 октября в минском ресторане «Друзья». Итог: заболели не только мы, но и часть приглашенных гостей и зрителей. Чем все это закончится – не знаю. Запахов не чувствую, температура 38 и выше. Пишу этот пост, очнувшись от спячки. Будьте бдительны!»

Алина ВЕТРОВА.

УТРАТА

«Сегодня умерла моя мама...»

*Юрист ОО «Белорусская ассоциация журналистов» **Олег Агеев** 2 ноября сообщил грустную новость: не стало его мамы, известного в прошлом адвоката **Татьяны Агеевой**.*

«Она легла в гастроэнтерологию 10-й городской клинической больницы Минска 3 недели назад, – поделился Олег. – *Там она заразилась COVID-19. Почти 7 суток мама была на аппарате ИВЛ. 2 ноября 2020 года в 4.50 ее сердце остановилось...*

Ей было 65 лет. За эти годы она подарила жизнь и воспитала двух сыновей, дождалась внучки и трех внуков. Любовь, которую она нам дарила, не восполнить уже ничем, и никакими словами не сгладить боль утраты...»



Татьяна Агеева была адвокатом Минской городской коллегии адвокатов начиная с 1982 года, позже стала членом президиума коллегии.

В феврале 2011 года Министерство юстиции лишило лицензий четырех адвокатов, защищавших обвиняемых по делу о массовых беспорядках 19 декабря в Минске. Лицензий лишились Олег Агеев, защищавший кандидата в президенты Алексея Михалевича, его мать Татьяна Агеева, Владимир Толстик и Тамара Гораева – бывшие адвокаты Ирины Халип.

В мае того же года по инициативе КГБ было возбуждено уголовное дело за подделку документов (ст.380 УК, нарушение обнаружили в процедуре заключения договоров с клиентами) в отношении адвокатов Татьяны Агеевой и Олега Агеева. Суд приговорил обвиняемых к штрафу, позже в отношении Татьяны Агеевой обвинительный приговор был отменен. Оба адвоката были лишены лицензии и права на работу адвокатом.

С 2012 года Татьяна Агеева работала юристом в Белорусском документационном центре.

«Две недели назад я разговаривала с ней по телефону, – рассказала в соцсетях руководитель Белорусского документационного центра **Раиса Михайловская.** – *Чувствовалось, что ей очень тяжело. И мне было неудобно, что позвонила не вовремя. «Выздоравливай, дорогая!» – все, что я смогла ей сказать... Она была очень сильным человеком, борцом. Она была мощным профессионалом. Прекрасной матерью и бабушкой. Я не могу сейчас взять себя в руки, слезы и невероятное чувство потери. Царство тебе небесное, дорогая наша Татьяна...»*

«Народная Воля» выражает соболезнования Олегу Агееву и всем близким Татьяны Агеевой.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Пераможца, якога не судзяць

Беларус Аляксей Шпілеўскі стаў самым маладым у гісторыі трэнерам, пад кіраўніцтвам якога камандзе ўдалося выйграць чэмпіянат Казахстана.

Казахстанскі “Кайрат” стаў чэмпіёнам краіны. Апошні раз каманда дасягала такога поспеху 16 гадоў таму! Здавалася б, якая тут навіна для беларусаў? Але справа ў тым, што гэту каманду з 2018 года ўзначальвае 32-гадовы беларускі спецыяліст **Аляксей ШПІЛЕЎСКІ**, пра якога варта распавесці падрабязней.



Партнёры Шпілеўскага па юнацкай зборнай Беларусі да гэтага часу гуляюць на прафесійным узроўні. У 2005 годзе з ім разам выходзілі на поле **Міхаіл Сівакоў** (зараз гуляе за “Арэнбург”), **Ягор Філіпенка** і **Станіслаў Драгун** (абодва ў БАТЭ). Той год стаў апошнім, калі юнацкая зборная Беларусі кваліфікавалася на чэмпіянат Еўропы.

Яшчэ да турніру Шпілеўскі атрымаў траўму спіны. Гуляў на ўколах, але да канца траўму так і не залячыў. Тады ён якраз перайшоў у юнацкую каманду “Штутгарта”, дзе і траўміраваўся на трэніроўцы. Замест футбольнай кар’еры пачаў трэнерскую, і ўжо ў 21 год у яго з’явілася ліцэнзія трэнера катэгорыі “А”.

Дарэчы, Аляксей – сын вядомага агента Мікалая Шпілеўскага, які ў свой час прадстаўляў інтарэсы Аляксандра Глеба. Калі Глеб гуляў у іспанскай “Барселоне”, Шпілеўскі-малодшы трапіў туды на стажыроўку для працы з дзецьмі.

Затым працаваў з нямецкімі камандамі, добра сябе зарэкамендаваў і патрапіў у акадэмію клуба “Лейпцыг”.

Аляксей з’ехаў з Германіі, калі захацеў большага. Распавядаў, што ўжо ў 30 гадоў выбіраў паміж работай з “маладзёжкай” і клубам, які гуляе ў Лізе Еўропы. Так і трапіў у родную Беларусь, дзе ўзначаліў брэсцкае “Дынама”. Праўда, у Брэсце ўсё пайшло не так: пасварыўся з лідарамі каманды, выступіў з адкрытым лістом наконт той сістэмы, што была пабудавана ў клубе, “Дынама” вылецела з Лігі Еўропы. Усё ішло да таго, што Шпілеўскі не будзе працаваць з гэтай камандай, і прагнозы спраўдзіліся – у Брэсце малады трэнер затрымаўся ўсяго на паўтара месяца.

“Кайрат” стаў для Шпілеўскага другім клубам у кар’еры, і ў Казахстане яго таксама шмат крытыкавалі за прамалінейную гульню і некаторыя гучныя выказванні.

Дарэчы, Аляксей ніколі не баяўся агучваць сваю пазіцыю, і пасля выбараў у Беларусі ён паспрабаваў дагрукацца да сумлення ўлад і сілавікоў.

“Я нікому нічога дрэннага не жадаю, – казаў ён. – *Я толькі жадаю некаторым людзям аднойчы сустрэцца з самімі сабой. Мне да гэтага часу не верыцца, што ёсць ворагі свайго ўласнага народа. Любімая Беларусь, трымайся і даруй за іх!”*

Трэба адзначыць яшчэ, што ў мінулым годзе СМІ Казахстана некалькі разоў адпраўлялі беларускага спецыяліста ў адстаўку, але, як бачым, сёння Аляксей Шпілеўскі на сваім месцы ў якасці пераможцы. А пераможцаў, як вядома, не судзяць.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СЕКРЕТЫ КРАСОТЫ

С чем можно сочетать сладкое?

*Многие люди, желающие снизить вес, уверены, что, худея, нужно полностью отказываться от сладкого. Но это не так, убеждена известный белорусский диетолог **Светлана Кашицкая.***

– Да, сладкое, мучное, выпечка – это быстрые углеводы, после употребления которых уровень сахара резко повышается, а потом так же быстро падает, и возникает функциональная гипогликемия – снова хочется сладкого, разыгрывается аппетит, – *объясняет диетолог.* – Поэтому, если вы не хотите поправляться, но любите полакомиться время от времени сладеньким или мучным, то лучше употребляйте их отдельным приемом пищи и до 16–17 часов!

Существуют продукты-помощники, которые обладают способностью замедлять усвоение быстрых углеводов, то есть снижать их гликемический индекс. Это белки и клетчатка.

Так, например, если вы любитель меда или варенья, то съешьте его с творогом. Клетчатка является прекрасным абсорбентом, и все остатки жиров, белков и углеводов она тщательно собирает и выводит из организма. Поэтому привычка есть больше овощей, особенно зеленых, злаковых и бобовых культур очень хороша! Клетчатка помимо нейтрализации углеводов утилизирует токсины, обеспечивая улучшение обменных процессов.

Не рекомендую есть сладкое сразу после еды – таким образом вы увеличиваете калорийность этого приема пищи в 1,5 раза.

Вывод: можно есть сладкое и не поправляться от этого. Вопрос только – когда и с чем!

Почему мы набираем лишний вес с возрастом?

Возраст не любит спешки и требует более внимательного отношения к себе во всем. И питание не исключение, говорит Светлана Кашицкая, ссылаясь на свою практику.

– С возрастом обмен веществ замедляется, жиры хуже расщепляются и усваиваются, поэтому и накапливаются в нашем организме, что и приводит к набору веса, – *говорит Светлана своим подписчикам в «Инстаграм».* – Этому способствуют сидячий образ жизни и падение уровня гормонов.



И если вы не увеличите физическую активность, не измените свой рацион, то легко наберете 3–4 килограмма лишнего веса за год!

Многие после 40 лет начинают набирать вес, несмотря на то, что питание и уровень физической активности не меняются. Замедляется метаболизм, то есть в состоянии покоя сжигается на 50–60 ккал в день меньше. На первый взгляд это не слишком много, но, если не изменить уровень физической активности и привычное питание, вы будете набирать вес!

Если же вы всегда обладали излишним весом и с возрастом добавили 10 килограммов и более, то для обмена веществ такая прибавка может стать катастрофой!

Чем это чревато?

Повышением давления и аритмией.

При дальнейшем уменьшении количества гормонов они не будут эффективно противостоять перегрузке, и объемы могут стремительно увеличиваться.

Быстрый набор килограммов убийственен для суставов и позвоночника. Лишний вес увеличивает уровень холестерина и закупоривает сосуды.

Всех этих неприятностей можно избежать, начав как можно раньше прислушиваться к себе и пересмотрев свое питание!

С возрастом нужно употреблять не очень жирную, но питательную и разнообразную еду.

Начните прямо завтра и приготовьте правильный завтрак: гречневую кашу и яйцо – всмятку или пашот.

Добавьте физические упражнения: плавайте, больше гуляйте пешком, максимально повышайте тонус мышц.

Позаботьтесь о себе и своих близких!

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Паколькі ў рэдакцыі няма магчымасці рэцэнзаваць і вяртаць нявыкарыстаныя матэрыялы, яна пакідае права ўступаць у перапіску за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Отпечатано в АО «Прайм Принт Москва», 141707,МО, г.Долгопрудный, Лихачевский пр-д, 5В. Подписано в печать 05.11.2020 в 17.00. Объем 4 печ. листа. Тираж 25000 экз. Заказ №3010.